Купить в Беларуси: http://belveter.by

М. І. Навумчык

# ТЭСТАВЫЯ ЗАДАННІ па беларускай літаратуры

# 7 клас

Дапаможнік для вучняў
устаноў агульнай сярэдняй адукацыі

Мазыр
«Белы Вецер»
2016

Купить в Беларуси: http://belveter.by

Купить в Беларуси: http://belveter.by

УДК 821.161.3
ББК 74.261.8(4Беи)я721
Н15

Р э ц э н з е н т ы :

кандыдат філалагічных навук, выкладчык беларускай мовы і літаратуры ДУА «Ліцей БДУ», настаўнік вышэйшай катэгорыі **М. М. Казлоўская**;

настаўніца беларускай мовы і літаратуры ДУА «Гімназія № 42 г. Мінска», лаурэат Нобелеўскай прэміі Ж. І. Алфёрава **А. І. Гулякевіч**

**Навумчык, М. І.**

Н15 Тэставыя заданні па беларускай літаратуры. 7 клас : дапаможнік для вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі / М. І. Навумчык. — Мазыр : Белы Вецер, 2016. — 66, [2] с. : іл.

ISBN 978-985-574-788-9.

Тэставыя заданні, распрацаваныя ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай, дазваляюць праверыць вучняў па ўзроўнях засваення, замацавання і абагульнення матэрыялу, уключаюць часткі А, В і С. У частцы А прапаноўваюцца заданні з адным ці некалькімі правільнымі варыянтамі адказу, у частцы В — заданні, у якіх адказам з'яўляецца слова або некалькі слоў, у частцы С — поўны (разгорнуты) адказ на адно ці некалькі пытанняў.

Рэкамендуюцца вучням, настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

**УДК 821.161.3**
**ББК 74.261.8(4Беи)я721**

**ISBN 978-985-574-788-9**

© ТАА ВД «Белы Вецер», 2016

Купить в Беларуси: http://belveter.by

Купить в Беларуси: http://belveter.by

# Ад аўтара

Як павысіць якасць адукацыі? Пытанне, якому не адзін год і над якім «б'ецца» не адно пакаленне педагогаў. Адказ жа на самой справе вельмі просты і вядомы ўсім. Для гэтага трэба зацікавіць вучня прадметам, выпрацаваць матывацыю ў неабходнасці набываць пастаянна новыя веды, жаданне з ахвотаю наведваць кожны ўрок, штодзённа павышаць свой адукацыйны ўзровень. Каб на працягу 45 хвілін на вучэбным занятку было цікава, трэба не толькі педагагічны такт настаўніка, уменне данесці матэрыял да свядомасці кожнага вучня, тлумачыць яго лагічна, паслядоўна, але і адпаведныя заданні.

У кожнага педагога ў метадычнай скарбонцы ёсць, напэўна, не адзін эфектыўны метад, прыём, сродак навучання, які вядзе да ўстойлівага засваення вучнямі зместу прадмета. Выбар заданняў, вядома ж, залежыць ад узросту, тыпу ўрока, узроўню здольнасцей вучняў, жыццёвага вопыту, іх схільнасцей да прадмета. Аднак неабходна памятаць, што на кожным уроку вучню павінна быць цікава, а па магчымасці і займальна. «А цікава — значыць не цяжка, — піша Ванда Паўлоўская ў сваёй кнізе "Мова: цікава і займальна". — Цікавае абвастрае зрок, актывізуе думку, абуджае творчасць...»

У школе працую амал 20 гадоў. Праведзена многа ўрокаў. Сярод іх ёсць і такія, што ўдаліся, прайшлі як бы на адным дыханні. Аналізуючы іх, атрымліваеш задавальненне ад зробленага. Аднак такія ўрокі патрабуюць сур'ёзнай, грунтоўнай падрыхтоўкі, удумлівай і пакрокавай прапрацоўкі кожнага этапу ўрока. Іншым разам, каб напісаць падрабязны сцэнарый яго, неабходна намнога больш часу, чым на само правядзенне.

Сярод мноства існуючых прыёмаў, метадаў, сродкаў навучання актыўна прымяняю тыя, што з'яўляюцца эфектыўнымі ў маёй педагагічнай практыцы. Гэта пацвярджаецца дасягнутымі вынікамі. Спрыяе таму і выкарыстанне



Купить в Беларуси: http://belveter.by

Купить в Беларуси: http://belveter.by

тэставага кантролю. Тэставыя тэхналогіі актыўна прымяняю і на ўроках літаратуры.

Сёння іх выкарыстанне для мяне — надзённы, актуальны і неабходны элемент педагагічнай дзейнасці, які дапамагае найперш у пошуку шляхоў фарміравання ў вучняў станоўчай матывацыі, унутранага імкнення да вывучэння беларускай мовы і літаратуры. Тэсціраванне аб'ектыўна паказвае ўзровень ведаў і ўменняў, інтэлектуальнага развіцця школьнікаў у адпаведнасці з мэтамі адукацыі. Прымяненне тэставых заданняў на ўроках роднай літаратуры дапамагае ўстанавіць узровень якасці адукацыі: чытацкай (рознабаковасць і сістэматычнасць чытання, сфарміраванасць эстэтычнага густу), літаратуразнаўчай і інтэрпрэтацыйнай (глыбіня і шырыня ўсведамлення ідэйна-мастацкага зместу твораў і іх формы, асобасны характар успрымання, абгрунтаванасць і самастойнасць ацэнкі).

Аднак напачатку маёй педагагічнай дзейнасці неабходных тэстаў па беларускай літаратуры ў дастатковай колькасці не было. Першыя з іх асобным выданнем з'явіліся пазней. Па гэтай прычыне ўзяўся сам за распрацоўку тэстаў. Іх на ўроках літаратуры цяпер пастаянна выкарыстоўваю пры вывучэнні аглядавых і манаграфічных тэм (у старэйшых класах), знаёмстве з біяграфічнымі звесткамі пісьменніка, праверцы зместу твора, для выяўлення яго чытацкага ўспрыняцця, праверцы асноў тэорыі літаратуры… У тэстах па літаратуры прадугледжваю наступныя заданні: з выбарам аднаго або некалькіх правільных адказаў з ліку прапанаваных; адкрытай формы, дзе адказ дапісвае сам вучань; на ўстанаўленне адпаведнасці ці правільнай паслядоўнасці сюжэту і інш.

Прымяняючы тэсты, заўважыў, што ў вучняў 5—7 класаў незаўсёды ёсць цікавасць іх выконваць. Некаторы час шукаў новыя формы. Лічу ўдалым варыянтам тэсты-лініі (ці тэсты-малюнкі). Іх сутнасць і навізна заключаецца ў наступным: у кожным пытанні неабходна выбраць адзін правільны адказ і злучыць кропкі-лічбы паслядоўна, якія пазначаны ў дужках пасля яго, на картцы адказаў. Калі правільна будзе выканана



Купить в Беларуси: http://belveter.by

Купить в Беларуси: http://belveter.by

заданне, то атрымаецца выява аднаго з герояў твора. Звычайна на бланку адказаў кропак-лічбаў больш, чым іх неабходна, каб «выйшаў» малюнак. Так раблю для таго, каб вучань выконваў заданні, а не спрабаваў адгадаць малюнак. Пяцісямікласнікам такія тэсты падабаюцца. Вучні іх выконваюць з задавальненнем і радасцю. Не раз бачыў, як ззяюць іх вочы ад таго, што на бланку адказаў атрымаўся любімы герой твора. Колькі станоўчых эмоцый і радасці!

Да тэстаў-ліній (тэстаў-малюнкаў) прад'яўляю тыя ж самыя патрабаванні, што і да іншых іх відаў. У такія тэсты ўключаю пытанні, якія правяраюць найперш веданне сюжэта твора, вобразна-выяўленчых сродкаў, элементаў кампазіцыі, уменне правільна вызначаць тэму, ідэю, узнятых аўтарам у творы. Прапаную таксама і пытанні, якія патрабуюць па характэрных кароткіх апісаннях пазнаць героя твора.

Падрыхтоўка такіх тэстаў займае шмат часу. Неабходна не толькі прыдумаць заданні, улічваючы ўзрост вучняў, але і стварыць пэўны малюнак. На напісанне кожнага з іх затрачваецца тыдзень, а то і два-тры. Тэсты-лініі (тэсты-малюнкі) лічу ўдалым варыянтам тэставых заданняў, якія можна і, пераканаыя, неабходна выкарыстоўваць на ўроках беларускай літаратуры.

Тэсты-лініі (тэсты-малюнкі) звычайна выкарыстоўваю пры правядзенні падагульняльных урокаў, урокаў-паўтарэнняў. Работу разлічваю на 45 хвілін. Перавага такіх тэставых заданняў яшчэ і ў тым, што на праверку настаўнікам затрачваецца зусім мала часу. Можна іх прапанаваць вучням і ў якасці дамашняга задання.

Праводзячы ў класе тэсціраванне, прытрымліваюся наступнага: прадугледжваю час (2—4 урокі ў раскладзе) і працягласць (не больш за адзін урок), характар дзейнасці вучняў да пачатку работы; улічваю ўзровень падрыхтоўкі класа, узрост дзяцей; прагназую магчымыя вынікі тэсціравання, праводжу аператыўна іх аналіз. Вынікі звычайна маюць дыягнастычны характар, раскрываюць прычыны ўзнікнення памылак, з'яўляюцца эфектыўным сродкам карэкціроўкі.



Купить в Беларуси: http://belveter.by

Купить в Беларуси: http://belveter.by

У тэставыя заданні ўключаю часткі А, В і С, якія, аднак, незаўсёды асобна выдзяляю. Зыходзячы з мэты кантролю, усе тры часткі ёсць не ва ўсіх тэстах. У частцы А прапаноўваю заданні з адным ці некалькімі правільнымі варыянтамі адказу, у частцы В — заданні, у якіх адказам з'яўляецца слова або некалькі слоў, у частцы С — поўны (разгорнуты) адказ на адно ці некалькі пытанняў. Гэта дазваляе праверыць, ці ёсць у вучняў цэласнае ўяўленне пра твор, які вывучаецца. Тэставыя заданні часткі А даюць магчымасць праверыць тэарэтычныя веды (асноўныя даты жыцця і творчасці пісьменніка, час напісання твора, яго структуру, жанрава-стылявыя адметнасці, асноўныя тэарэтычныя паняцці літаратуры і г. д.). Тут змяшчаюцца заданні рэпрадуктыўнага і аналітычнага характару (вызначыць тэматыку, праблематыку твора, яго ідэйны змест, эстэтычны пафас, маральна-этычны канфлікт). Заданні часткі А часта ўяўляюць сабой спалучэнне знаёмага і незнаёмага матэрыялу, што зацікаўлівае вучня, стымулюе да ацэначных актаў у пазнавальнай дзейнасці.

Тэставыя заданні могуць мець «невялічкі ўступ», сказ ці два, якія ўводзяць у сутнасць справы, служаць напамінаннем пра пэўнае тэарэтычнае і літаратурнае паняцце, пра асаблівасць кампазіцыі ці будовы, рысы характару героя. У іх традыцыйна правільных адказаў можа быць ад 2 да 4. Аднак у некаторых — нават усе 5 з 5. У такіх тэстах для вучняў абавязкова пазначаю, што ў іх ёсць заданні (звычайна 2—3), дзе правільнымі адказамі з'яўляюцца ўсе прапанаваныя варыянты. Гэта лічу апраўданым, бо яно спрыяе большай пільнасці і ўважлівасці вучняў пры выкананні тэстаў.

У тэставых заданнях часткі В правяраецца веданне тэксту твора. Ва ўмове да іх пазначаю: «Упішыце словы (словазлучэнні), якія адсутнічаюць у прапанаваных урыўках». Адказ залічваю як правільны нават тады, калі вучань упісаў не тое слова (словазлучэнне) пры ўмове, што яго сэнс набліжаны да аўтарскага.

Заданні часткі С (іх можа быць ад 2 да 5) патрабуюць звычайна напісання звязнага тэксту (адказу) аб'ёмам прыкладна ад



Купить в Беларуси: http://belveter.by

Купить в Беларуси: http://belveter.by

4—5 да 7—8 сказаў. У некаторых тэстах яе вылучаю асобна. Выкананне такіх заданняў дазваляе вучням паказаць месца і ролю эпізоду (сцэны) у агульнай структуры твора (аналіз фрагмента), раскрыць сюжэтна-кампазіцыйныя, вобразна-тэматычныя і стылістычныя асаблівасці тэксту, які аналізуецца, абагульніць свае назіранні, выказаць уласныя думкі на пытанні (праблемы), якія ўзняты на старонках твора, правесці паралелі паміж творамі аднаго аўтара і рознымі. У некаторых тэстах частка В адсутнічае, а частка С асобна не выдзяляецца. Такая разнастайнасць тэставых заданняў дазваляе мне працаваць больш эфектыўна, арыентуючыся на высокі вынік.

Распрацаваныя тэставыя заданні можна выкарыстоўваць на ўроках сістэматызацыі, падагульнення і кантролю ведаў. Тэставыя заданні можна выкарыстоўваць як выбарачна, так і ў комплексе.

Купить в Беларуси: http://belveter.by

Купить в Беларуси: http://belveter.by

# Змест

*Ад аўтара* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

Янка Купала. Паэма «Курган» . . . . . . . . . . . . . . . . 8

Васіль Быкаў. Апавяданне «Незагойная рана» . . . . . . 14

Змітрок Бядуля. Апавяданне «На Каляды к сыну» . . . 21

Янка Брыль. Аповесць «Сірочы хлеб» . . . . . . . . . . . 27

Іван Навуменка. Апавяданне «Жуль Верн» . . . . . . . . 35

Мікола Лупсякоў. Апавяданне «Мэры Кэт» . . . . . . . . 42

Уладзімір Караткевіч. Нарыс «Зямля пад белымі крыламі». Заданне 1 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49

Уладзімір Караткевіч. Нарыс «Зямля пад белымі крыламі». Заданне 2 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55

*Правільныя адказы* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62

---

Вучэбнае выданне

**НАВУМЧЫК** Мікалай Іванавіч

**ТЭСТАВЫЯ ЗАДАННІ ПА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ**

**7 клас**

Дапаможнік для вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі

Адказны за выпуск *А. У. Зуева*

Вядучы рэдактар *Л. А. Стоўба.* Мастак *А. М. Рогава*
Мастак вокладкі *А. М. Рогава.* Камп'ютарная вёрстка *Л. А. Стоўбы*

Падпісана да друку з арыгінал-макета 01.02.2016. Фармат 60x84 1/16. Папера афсетная. Друк лічбавы. Ум. друк. арк. 3,95. Ул.-выд. арк. 2,04. Тыраж 2013 экз. Заказ 66/5747889-1.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Выдавецкі Дом «Белы Вецер». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/35 ад 16.01.2015. 247760, г. Мазыр, вул. Савецкая, 198/4. Тэл./факс (0236) 32-51-03, 32-51-22. Філіял: 220007, г. Мінск, вул. Валадзько, 30, оф. 417. Тэл. (017) 224-66-89, 298-50-26, 298-50-27. http://belveter.by.
E-mail: book@belveter.by

Купить в Беларуси: http://belveter.by